# Станаўленне прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі (1917–1941 гг.)



**КУЗЬМІНІЧ Мікалай Леанідавіч** – прарэктар па мастацкай творчасці і выхаваўчай рабоце Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, прафесар кафедры псіхалогіі педагогікі, кандыдат педагагічных навук

Станаўленне сучаснай сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі адбывалася ва ўмовах палітычнай і сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі беларускага грамадства. Краіна заставалася арэнай сусветнай і грамадзянскай войнаў, палітычнага супрацьстаяння, замежнай інтэрвенцыі. Многія мясцовыя музыканты, якія з'яўляліся носьбітамі назапашаных у папярэднія дзесяцігоддзі традыцый музычнага выхавання і навучання, загінулі ці знаходзіліся ў эміграцыі. Значна змяніліся сацыяльны склад навучэнцаў музычных устаноў, кола іх музычных інтарэсаў і патрэбнасцей. Цяжкае эканамічнае становішча у краіне таксама не спрыяла хуткаму развіццю музычнай культуры, у тым ліку і прафесійнай музычнай адукацыі. У такіх умовах музычныя навучальныя установы Беларусі прайшлі няпросты шлях да стварэння стройнай сістэмы падрыхтоўкі прафесійных музыкантаў.

Прыватныя музычныя навучальныя установы прыфрантавога Мінска восенню 1917 года не працавалі ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі і рэвалюцыйнымі падзеямі. У лютым 1918 года горад быў акупіраваны войскамі кайзераўскай Германіі. Менавіта ў гэты час у Мінску былі прыняты меры па стварэнні новай прафесійнай музычнай навучальнай установы. Па ініцыятыве М.А.Вярата 22 красавіка 1918 года адкрылася Вышэйшая музычная школа (паводле некаторых звестак, прыватная). 1 чэрвеня ў адпаведнасці з распараджэннем Народнага сакратарыята Беларускай Народнай Рэспублікі яна былаператворана ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. Дырэктарам быў прызначаны прафесар Варшаўскай кансерваторыі Г.С.Жураўлёў, заняткі вялі прафесар І.Э.Свідовіч, выкладчыкі Усцюжанінаў, М.Э.Маўшовіч, М.Р.Шапіра, В.А.Андога. У навучальным працэсе акцэнт рабіўся на вакальна-харавое навучанне: быў створаны аддзел па вывучэнні беларускай народнай песні, гісторыі беларускай культуры і беларускай харавой капэлы[1].

Пасля вызвалення Мінска ў снежні 1918 года войскамі Чырвонай Арміі ад нямецкіх войскаў і ўсталявання Савецкай улады Наркамат асветы БССР і Белнацкам у Маскве распрацавалі праграму развіцця культурнага жыцця ў Савецкай Беларусі. Акрамя стварэння Беларускага савецкага тэатра, перасоўных труп, тэатральных гурткоў-студый, 19 хароў і 32 аркестраў (у тым ліку 4 сімфанічных і 28 народных) планавалася адкрыць кансерваторыю і шэраг музычных школ у розных гарадах рэспублікі. Кансерваторыя ў Мінску ў 1919 годзе, як і раней, называлася Беларускай дзяржаўнай, хоць, па сутнасці, былаператворана ў народную кансерваторыю накшталт Віцебскай. Важнейшымі напрамкамі работы народнай кансерваторыі, акрамя музычнага навучання, былі культурна-асветніцкая дзейнасць, арганізацыя выступлення мастацкіх калектываў, правядзен-

не канцэртна-лекцыйнай работы сярод шырокіх мас. Дырэктарам народнай кансерваторыі быў прызначаны кампазітар Т.Шнітман.

Аднак Савецкая ўлада пратрымалася ў Мінску толькі да жніўня 1919 года, калі сталіца Савецкай Беларусі была захоплена войскамі Польшчы. Польскія ўлады праводзілі ў Беларусі палітыку паланізацыі: закрывалі беларускія школы і ўстановы культуры, арыштоўвалі дзеячаў беларускага нацыянальнага руху і настаўнікаў беларускіх школ. У такіх умовах народная кансерваторыя да восені 1920 года не працавала.

Пасля заканчэння акупацыі ў ліпені 1920 года ў музычнай адукацыі беларускай сталіцы пачаліся актыўныя пераўтварэнні. У газеце "Звезда" ад 8 верасня 1920 года з'явілася інфармацыя, што "з 15 верасня ў г. Мінску адкрываецца музычным пададдзелам Наркамасветы Дзяржаўная Кансерваторыя Беларусі". (Зразумела, размова ішла пра аднаўленне дзейнасці закрытай польскімі ўладамі кансерваторыі.) У кансерваторыю, якая знаходзілася на вул. Койданаўскай, 22, былі залічаны 150 чалавек. Аднак праз некаторы час у газеце "Звезда" ад 21 снежня 1920 года з'явілася паведамленне, што аддзел мастацтваў Наркамата асветы "адракаецца ад кансерваторыі, рэарганізуючы яе ў школы I–II ступені, з агульнаадукацыйным курсам, на які маюць права паступіць усе без абмежавання ўзросту... Указаныя школы ўзначальваюцца Дзяржаўным Музычным Універсітэтам, які ўключае ў сябе ўсе галіны музычнага мастацтва і творчасці па-факультэтна". Навучанне ў школе павінна было ўключаць слуханне музыкі і жывыя гутаркі, распаўсюджванне музычных ведаў шляхам чытання лекцый і арганізацыі канцэртаў у мэтах далучэння да музычнага мастацтва шырокіх мас і ўздыму іх мастацкай свядомасці.

Неабходнасць стварэння ў Мінску музычна-асветніцкай арганізацыі (народнай кансерваторыі) не выклікала сумнення. У той жа час гораду і ўсёй краіне неабходна была ўстанова прафесійнай музычнай адукацыі па падрыхтоўцы музыкантаў-выканаўцаў, педагогаў, музыказнаўцаў. На жаль, план стварэння сеткі музычных навучальных устаноў, у тым ліку і кансерваторыі, якія былі распрацаваны ў 1919 годзе, былі забыты. У 1921 годзе кансерваторыя была рэарганізавана ў дзяржаўную музычную школу (музычныя школы) I і II ступеняў з 4- і 3-гадовым тэрмінам навучання. Былі праведзены асобны набор моладзі ў класы фартэпіяна (выкладчыкі Г.Бах, Р.Маўшовіч, Я.Цір і інш.), спеваў (В.Абрамовіч, Н.Карафа-Корбут), скрыпкі (Ю.Жухавіцкі), тэорыі музыкі і сальфеджыо (Т.Шнітман). Дырэктарам школы II ступені стаў Т.Шнітман, віяланчэліст Б.Фідлон – у школе I ступені. Школа складалася з малодшага, сярэдняга і старэйшага курсаў. К сярэдзіне 1923 года тут быў адкрыты клас духавых інструментаў. Ва ўмовах нэпа навучанне для большасці навучэнцаў было платнае. Толькі 25% з іх вучылася бясплатна за кошт Савета прафсаюзаў Беларусі.



*Мінскае дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.І.Глінкі, якое ў кастрычніку 2004 г. адсвяткавала 80-гадовы юбілей*

Афіцыйнага дзялення навучэнцаў на дзве катэгорыі (адпаведна I і II ступені) не было. У школе вучыліся і дзеці, і дарослыя. Яны мелі самы розны ўзровень музычных ведаў і навыкаў. Канцэрты навучэнцаў карысталіся поспехам у гарадской публікі. Гэта сведчыла пра тое, што школа была лепшай прафесійнай музычнай навучальнай установай у краіне.

У беларускіх афіцыйных дакументах, газетных публікацыях і тым больш у гарадскім асяроддзі ў 1920–1924 гадах існавала поўная блытаніна з назвамі музычных навучальных устаноў. Так, у газеце "Звезда" ад 22 жніўня 1923 года ў артыкуле пра музычную школу ў Мінску яе называюць Дзяржаўнай кансерваторыяй. У "Звезде" ад 5 чэрвеня 1924 года школа называецца музычным тэхнікумам, але ў гэтай жа газеце ад 10 чэрвеня 1924 года яна разглядаецца як пачатковая ступень музычнай адукацыі. У нумары ад 14 чэрвеня 1924 года гаворка ідзе пра неабходнасць пераўтварыць музычную школу ў тэхнікум для падрыхтоўкі прафесійных музыкантаў, збору і апрацоўкі беларускіх народных песень, пра яго адкрыццё з восені 1924 года. У жніўні 1924 года "Звезда" піша пра неабходнасць "рэарганізацыі тэхнікума ў беларускую кансерваторыю, якая і павінна стаць цэнтрам музычнай адукацыі ў БССР". Адным словам, ішлі пошукі шляхоў вызначэння профілю дзейнасці навучальных устаноў, размежавання задач спецыяльнай адукацыі і музычнай асветы, стварэння цэласнай сістэмы музычнай адукацыі, якая забяспечыла б сістэматызацыю навучання. У аснову стварэння сістэмы навучальных устаноў прапаноўвалася пакласці ўзроставы прынцып, узровень развіцця музычных здольнасцей і прафесійную накіраванасць навучэнцаў, кваліфікацыю настаўнікаў.

Беларускі дзяржаўны музычны тэхнікум у Мінску быў адкрыты ў кастрычніку 1924 года (з 1937 года — музычнае вучылішча, у 1957 годзе яму прысвоена імя М.І.Глінкі). Сярод першых 144 навучэнцаў былі і тыя, хто паступаў у мінскую кансерваторыю, вучыўся ў мінскай музычнай школе і ў рэшце рэшт апынуўся ў музычным тэхнікуме.

Тэхнікум узначаліў скрыпач і дырыжор А.Бяссмертны. Сярод вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кладчыкаў былі выпускнікі Пецярбургскай і Маскоўскай кансерваторый В.Сямашка, Г.Пятроў, Я.Прохараў, Ю.Дрэйзін, выкладчыкі мінскай музычнай школы, а таксама запрошаныя з іншых гарадоў Беларусі, Расіі, Украіны музыканты – В.Селях, Л.Беланоўская, О.Несцярэнка, Е.Талонкіна, Е. і С.Жыў, В.Цвяткоў і інш. Дзейнічалі класы фартэпіяна, скрыпкі, віяланчэлі, кампазіцыі.

У гэты перыяд трэба было ўдасканальваць вучэбныя планы тэхнікума для розных спецыяльнасцей, адкрываць новыя, забяспечваць пераемнасць у вучэбных планах музычных школ і тэхнікума, запрашаць кваліфікаваных выкладчыкаў. Гэтыя і іншыя праблемы сталі прадметам абмеркавання ў рэспубліканскім друку, на шэрагу нарад і семінараў[2].

Нарада аб стане і шляхах далейшага развіцця музычнай адукацыі, праведзеная Наркаматам асветы БССР у снежні 1925 года, канстатавала неабходнасць падрыхтоўкі ў тэхнікуме не толькі музыкантаў-выканаўцаў, але і выкладчыкаў музыкі для агульнаадукацыйных школ, кіраўнікоў народных харавых калектываў. Таксама было прынята рашэнне, якое прадвызначыла наступны важны крок у пошуку аптымальнай мадэлі прафесійнай музычнай адукацыі ў краіне. Размова ішла пра стварэнне сеткі прафесійных музычных навучальных устаноў трох ступеней з узгодненымі паміж сабой праграмамі навучання: I ступень — вышэйшая (кансерваторыя ў Мінску), II — сярэдняя спецыяльная (музычныя тэхнікумы ў Віцебску, Гомелі, Магілёве, Бабруйску), III — пачатковая (дзіцячыя музычныя школы з дзяржаўным фінансаваннем у кожнай акрузе краіны). Музычныя школы павінны былі забяспечыць навучанне дзяцей з развітымі музычнымі здольнасцямі і з перспектывай атрымання прафесіі музыканта. Было прынята рашэнне пра адкрыццё пры мінскім тэхнікуме падрыхтоўчай музычнай школы для 200 навучэнцаў, яму перадаваўся новы будынак з канцэртнай залай на 350 месцаў.

Усеагульнае музычнае выхаванне дзяцей здзяйснялася ў агульнаадукацыйных школах (урокі музыкі праходзілі два разы ў тыдзень на працягу ўсяго тэрміну навучання). Задачу музычнага выхавання дарослых у сярэдзіне 1920-х гадоў з поспехам вырашалі музычныя студыі і калектывы мастацкай самадзейнасці, якія ствараліся пры кожнай клубнай установе[3].

На працягу першага года навучання ў мінскім тэхнікуме пачалі працаваць аркестравае аддзяленне з аркестравым класам пад кіраўніцтвам віцебскага скрыпача А.Бяссмертнага, харавы клас пад кіраўніцтвам полацкага хормайстра М.Мацісона, клас харэаграфіі пад кіраўніцтвам ленінградскай балерыны Собалевай. На вакальным аддзяленні распачалася оперная падрыхтоўка салістаў пад кіраўніцтвам кіеўскага прафесара В.Цвяткова.

У 1925/26 навучальным годзе былі распрацаваны планы кампазітарскага і інструктарска-педагагічнага аддзяленняў, пачаў свае выступленні сімфанічны аркестр навучэнцаў пад кіраўніцтвам А.Бяссмертнага, у оперным класе В.Цвяткова была падрыхтавана опера "Русалка" на беларускай мове, на радыё рэгулярна выходзілі музычныя перадачы з удзелам выкладчыкаў і навучэнцаў, у перыядычных выданнях друкаваліся крытычныя артыкулы пра беларускую музыку і музычную адукацыю. На інструктарска-педагагічным аддзяленні пад кіраўніцтвам Ю.Дрэйзіна пачалася падрыхтоўка будучых кіраўнікоў самадзейных харавых і інструментальных гурткоў і калектываў для клубаў і агульнаадукацыйных школ. У аснову іх падрыхтоўкі было пакладзена засваенне арганізацыйна-педагагічных навыкаў кіравання мастацка-творчым працэсам, выхаванне высокай маральнасці і палітычнай граматнасці.

Вопыт распрацоўкі вучэбных планаў у Мінскім музычным тэхнікуме быў карысны для ўсіх навучальных устаноў краіны. Таму на канферэнцыях і нарадах ставілася пытанне аб распрацоўцы адзінага вучэбнага плана для ўсіх прафесійных музычных навучальных устаноў, аб арганізацыі пры навучальных установах агульнаадукацыйных класаў з профільным выкладаннем прадметаў[4].

У 1926 годзе музычная школа I і II ступеняў была рэарганізавана ў Цэнтральную музычную школу (дзіцячую школу-сямігодку сучаснага тыпу) з мэтай падрыхтоўкі навучэнцаў для паступлення ў тэхнікум[5]. Стварэнне тэхнікума і дзіцячай школы-сямігодкі сведчыць пра тое, што быў знойдзены аптымальны варыянт стварэння сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі, у аснову якой былі пакладзены ўзроставы прынцып і прафесійная арыентацыя навучэнцаў.

У мэтах пашырэння падрыхтоўкі кіраўнікоў самадзейных клубных і школьных хароў і аркестраў у 1927/28 навучальным годзе пры тэхнікуме адкрыліся вячэрнія народныя курсы, на якіх Дз.Захар арганізаваў аркестр народных інструментаў. Набор на кароткачасовыя курсы для ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці потым праводзіўся рэгулярна. У гэтым жа годзе сіламі выкладчыкаў і навучэнцаў на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-1) была пастаўлена опера "Фауст".

У 1928 годзе ў тэхнікуме адбыўся першы выпуск. На жаль, выпускнікі аказаліся не запатрабаванымі на рынку працы Мінска, і многія з іх папоўнілі шэрагі беспрацоўных. Колькасны рост прафесійных музыкантаў у горадзе выклікаў незадавальненне прафсаюза працаўнікоў мастацтва (БелРабИс — "белорусские работники искусства"), які аб'ядноўваў артыстаў тэатральнага, эстрадна-цыркавога і музычнага мастацтваў і дапамагаў ім знайсці працу, у тым ліку і часовую. Распачалася барацьба, якая суправаджалася выступленнямі ў друку ў адрас кіраўніцтва і выкладчыкаў тэхнікума з абвінавачваннямі ў непрафесіяналізме і аўтарытарызме, антысаветызме і антысемітызме, безгаспадарчасці і адсутнасці метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу. Прапаноўвалася пераўтварыць тэхнікум у навучальную ўстанову па падрыхтоўцы толькі інструктараў мастацкай самадзейнасці. Аднак пасля праведзеных праверак была дадзена станоўчая ацэнка дзейнасці тэхнікума, і асноўная мэта праціўнікаў — ліквідаваць прафесійна арыентаваную падрыхтоўку музычных кадраў — не была дасягнута.

Вялікая колькасць мінскіх беспрацоўных музыкантаў, сярод якіх былі і першыя выпускнікі тэхнікума,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вымушана была з'ехаць у Маскву, Ленінград і іншыя гарады. Там яны атрымлівалі вышэйшую адукацыю. Некаторыя пасля заканчэння кансерваторый (Р.Пукст, М.Бергер, І.Цвятаева і інш.) вярнуліся ў Мінск.

Кіраўніцтва тэхнікума шукала шляхі вырашэння праблемы працаўладкавання выпускнікоў: адкрываліся класы (курсы) па праграмах вышэйшых музычных навучальных устаноў (вакал, фартэпіяна, аналіз музычных твораў), было прынята рашэнне ўрада пра абавязковае размеркаванне на працу выпускнікоў тэхнікума. У 1929 годзе ў Мінску быў сфарміраваны сімфанічны аркестр пры Рэспубліканскім радыёкамітэце.

Разнастайныя праблемы далейшага развіцця сістэмы музычнай адукацыі ў краіне былі разгледжаны на Усебеларускай музычнай нарадзе, якая адбылася ў канцы 1929 года. У выступленнях і дакументах знайшлі дакладнае размежаванне праблемы прафесійнага музычнага навучання, музычнага выхавання ў агульнаадукацыйнай школе і музычнай асветы шырокіх мас у рабочых клубах і іншых культурна-асветных установах[6].

У 1930 годзе ў музычным тэхнікуме пачала працаваць оперная студыя з мэтай падрыхтоўкі кадраў для будучага нопернага тэатра. З гэтай жа мэтай быў створаны Беларускі дзяржаўны тэхнікум сцэнічнага мастацтва, які праіснаваў з 1931 па 1933 год. У далейшым выпускнікі тэхнікумаў склалі аснову высокапрафесійных нацыянальных творчых калектываў — Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, драматычных тэатраў, сімфанічнага і народнага аркестраў, хароў, філармоніі.

У 1931 годзе пры Радыёкамітэце быў сфарміраваны Беларускі хор. У 1932 годзе пачаў працаваць Саюз кампазітараў БССР. У 1933-м адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета, а ў 1937-м — Беларуская дзяржаўная філармонія, у склад якой увайшлі акадэмічны хор, харавая капэла, ансамбль беларускай песні і танца, вакальны і струнны квартэты, сімфанічны аркестр, салісты і акампаніятары, аркестр беларускіх народных інструментаў. У 1938 годзе дзверы расчыніла Рэспубліканскае тэатральнае вучылішча з драматычным і харэаграфічным аддзяленнямі. Пашырэнне сеткі прафесійных музычных калектываў і адкрыццё кансерваторыі знялі праблему працаўладкавання выпускнікоў сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі. Такога імклівага развіцця музычнай культуры раней Беларусь ніколі не ведала.

Больш за дзесяць гадоў спатрэбілася Савецкай Беларусі, каб рэалізаваць планы адкрыцця вышэйшай музычнай навучальнай установы — Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Гэтаму спрыяў шэраг абставін: масавае развіццё музычнай самадзейнасці, рэалізацыя прынцыпу ўсеагульнага музычнага выхавання ў школе, наспелая неабходнасць стварэння прафесійных музычных калектываў і інш. Да таго ж у 1928 годзе ў Мінскім музычным тэхнікуме быў ужо адкрыты клас вакалу па праграме вышэйшай навучальнай установы, а на базе драматычнага класа — беларуская драматычная студыя; у 1929 годзе пачала працаваць оперная студыя, у 1930-м — спецкурсы па фартэпіяна і аналізе музычных твораў па праграмах вышэйшай навучальнай установы. У драматычнай студыі былі падрыхтаваны першыя артысты балета і акцёры для БДТ-1.

15 лістапада 1932 года на базе тэхнікума адкрылася Беларуская дзяржаўная кансерваторыя (з 1934 года носіць імя А.В.Луначарскага, з 1991 года — Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі). Навучанне вялося на фартэпіянным, струнным, духавым, вакальным, кампазітарскім, дырыжорскім, харавым, інструктарска-педагагічным аддзяленнях. Вакол дзейнасці інструктарска-педагагічнага аддзялення кансерваторыі разгарнулася працяглая дыскусія. Абмяркоўваліся праблемы невысокай музычна-прафесійнай падрыхтаванасці студэнтаў, абмежаванасці зместу іх музычнай падрыхтоўкі, дубліравання падрыхтоўкі спецыялістаў на іншых аддзяленнях. Узнікла унікальная магчымасць сфарміраваць у межах кансерваторыі ў дадатак да выканальніцкіх аддзяленняў музычна-педагагічны факультэт і факультэт па падрыхтоўцы арганізатараў самадзейнай музычнай творчасці. Але было прынята рашэнне, скіраванае на першачарговае забеспячэнне кадрамі прафесійнага музычнага мастацтва. Інструктарска-педагагічнае аддзяленне ліквідавалася, музычна-педагагічны факультэт не быў створаны, а педагагічная падрыхтоўка выканаўцаў забяспечвалася асобна на кожным аддзяленні. У 1935 годзе адкрылася секцыя акампаніятараў, а ў 1939-м — аддзяленне народных інструментаў. Сярод выкладчыкаў кансерваторыі найбольшым аўтарытэтам карысталіся былы прафесар Маскоўскай, Адэскай і Кіеўскай кансерваторый кампазітар В.Залатароў, выпускнік Маскоўскай кансерваторыі піяніст Г.Пятроў, выпускнік Ленінградскай кансерваторыі дырыжор І.Мусін і інш. На кафедрах былі падрыхтаваны падручнікі па музычнаму выхаванню, тэорыі музыкі, школы ігры на цымбалах, кантрабасе, ударных інструментах, арганізавана навукова-даследчая работа. Выкладчыкі і студэнты актыўна займаліся канцэртнай і лектарскай дзейнасцю. Ідэалам тагачаснага выкладчыка кансерваторыі лічыўся музыкант, які сумяшчаў прафесіі педагога, саліста, аркестравага выканаўцы, дырыжора, лектара, навукоўца, удзельнічаў у камерным ансамблі і г.д.

У адпаведнасці з загадам урада ад 15 лістапада 1935 года пры Беларускай кансерваторыі па прыкладу Адэскай, Маскоўскай і Ленінградскай кансерваторый было створана аддзяленне юных талентаў (з 1939 года — музычная школа-дзесяцігодка, з 1947-га — сярэдняя спецыяльная музычная школа, з 1991-га — ліцэй, з 1998-га — вучэбны комплекс "Гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі"). Сярод яе навучэнцаў аказаліся пераможцы шматлікіх музычных алімпіяд і конкурсаў. Так у рэспубліцы распачалася мэтанакіраваная работа па выяўленні і пошуку музычна адораных дзяцей з мэтай падрыхтоўкі іх да навучання ў кансерваторыі. Для забеспячэння калектываў мастацкай самадзейнасці кваліфікаванымі кадрамі ў 1936 г. пры кансерваторыі, як і пры музычным тэхнікуме, адкрыліся курсы для дарослых.

Музычныя навучальныя ўстановы з'яўляліся сапраўднымі вучэбнымі, навукова-даследчымі, метадычнымі, культурна-асветніцкімі, канцэртна-прапагандысцкімі цэнтрамі музычнага жыцця Мінска і рэспублікі. Яны акумулявалі ў сваёй дзейнасці ўсе кірункі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця музычнай культуры грамадства: музычную асвету шырокіх мас і развіццё музычнай самадзейнасці, музычнае выхаванне падрастаючага пакалення, развіццё прафесійнай музычнай творчасці, даследаванне і падтрымку фальклорнага мастацтва, падрыхтоўку кадраў выканаўцаў, тэарэтыкаў, педагогаў, навукоўцаў, арганізатараў мастацкай самадзейнасці і музычнага выхавання.

Такім чынам, задача стварэння трохступеньчатай сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі была вырашана ў Мінску праз адзінаццаць гадоў пасля заканчэння савецка-польскай вайны і падпісання Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 годзе. За гэты час музычная адукацыя прайшла праз пакутлівыя пошукі сваёй структуры, праз удакладненне адукацыйных форм, вызначэнне задач і функцый разнастайных музычных устаноў, удасканаленне вучэбных планаў, праграм і методык выкладання. У выніку стабілізавалася арганізацыйная структура прафесійнай музычнай адукацыі, была створана цэнтралізаваная эфектыўная мадэль падрыхтоўкі прафесійных музыкантаў, якая забяспечвала рэалізацыю важнейшых арганізацыйна-адукацыйных прынцыпаў: даступнасці, масавасці і дэмакратызму пачатковай музычнай адукацыі, пераемнасці і непарыўнасці адукацыйных узроўняў і ступеней, структурнай цэласнасці сістэмы музычнай адукацыі, яе сувязі з сістэмамі агульнай адукацыі і масавага музычнага выхавання, самадзейнай музычнай творчасцю, арганічнага спалучэння ў змесце музычнай адукацыі нацыянальнага і інтэрнацыянальнага пачаткаў, а таксама навуковасці, свецкага характару, ідэйнасці музычна-педагагічнай і мастацка-творчай дзейнасці.

*Працяг будзе.*

[1] Мазец В. На шляху да дзяржаўнасці // Культура. 1992, 25 сакавіка.
[2] Савецкая Беларусь. 1925, 13 лістапада.
[3] Звезда. 1925, 15 снежня.
[4] Савецкая Беларусь. 1926, 4 красавіка.
[5] Звезда. 1926, 11 лістапада.
[6] Звязда. 1929, 18 лістапада.



# Прыгонныя мастацкія школы ў Паставах канца XVIII стагоддзя



**АЛЕКСІНА Іна Антонаўна – старшы выкладчык кафедры тэатральнай творчасці БДУ, кандыдат мастацтвазнаўства**

Стварэнне мастацкіх школ у Беларусі ў канцы XVIII стагоддзя было непасрэдна звязана з узнікненнем і развіццём прыгонных тэатраў. Прычына з'яўлення іх, як лічыць мастацтвазнавец Г.І.Барышаў, "... не толькі ў тым, што гэта было неабходна для "отдохновения души" і велікасвецкіх забаў, але і ў тым, што польскія магнаты і рускія вяльможы бачылі ў тэатры магутны сродак "рэпрэзентацыі", прадстаўніцтва двара, яго важкасці не толькі ў вачах дробнай шляхты, але і ў вачах суседзяў — буйных арыстакратаў"[1].

Менавіта ў гэты перыяд мастацкае жыццё Беларусі вызначаецца разнастайнасцю. Узнікаюць маёнткавыя тэатры ў гарадах і мястэчках, атрымліваюць пашырэнне паратэатральныя дзействы культуры так званага сармацкага барока[2]. У мэтах падрыхтоўкі сваіх, больш танных у параўнанні з запрошанымі акцёраў для прыватных тэатраў адкрываюцца першыя драматычныя, балетныя і музычныя школы, у якіх выкладаюць вядучыя прафесійныя майстры з Заходняй Еўропы. Маёнткавы тэатр і мастацкія школы XVIII стагоддзя аказалі значны ўплыў на далейшае развіццё нацыянальнай прафесійнай сцэны, паколькі ў гэты перыяд адбыва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ